# СВАБОДА

**БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА** **№ 19 (68),17-23.05.2007 г.**


# АПОШНЯЯ КАШУЛЯ

## КАЛІ КАРОЛЬ – ГОЛЫ, РАСПРАНАЦЦА ДАВОДЗІЦЦА НАРОДУ

Неверагодна, але факт. Законапраект аб скасаванні льготаў, які закранае добрую палову жыхароў Беларусі, выклікаў даволі млявую рэакцыю ў грамадстве. Калі не лічыць марша інвалідаў-калясачнікаў (пра гэта наша газета пісала ў мінулым нумары) ды некалькіх акцыяў студэнтаў у Мінску, пратэстаў амаль не відаць.

Нядаўна давялося размаўляць з пенсіянеркай, якая жыве ў горадзе і атрымлівае ветэранскую пенсію. Пачуўшы ад мяне пра скасаванне льготаў, у тым ліку – ветэранам вайны, яна спачатку не паверыла. А потым з упэўненасцю сказала: думаю, 50-працэнтнай льготы пры аплаце камунальных паслугаў Лукашэнка нас не пазбавіць.



**Студэнты на знак** *пратэсту супраць скасавання льготаў скідаюць з сябе вопратку каля Міністэрства адукацыі. Мінск, 10 траўня 2007 году.*

Хлопца, які, пачуўшы ў тралейбусе размову пра льготы, саркастычна заўважыў: скажыце дзякуй вашаму Лукашэнку, бабулькі ледзьве не парвалі на шматкі.

Большасць пенсіянераў па-ранейшаму верыць – кіраўнік дзяржавы такога не дапусціць. Ён свой народ ад чыноўнікаў абароніць.

Між тым, дзяржаўныя СМІ пачалі ўжо кампанію па растлумачэнні неабходнасці і карыснасці будучых зменаў. Агенцтва Інтэрфакс прыводзіць выказванне чыноўніцы Міністэрства працы Тацціяны Пагонышавай аб тым, што зараз у заканадаўстве прадугледжана звыш 20 падставаў для выхаду на пенсію раней за агульнапрыняты тэрмін. Акрамя таго, у нашай краіне – самая нізкая мяжа выхаду на пенсію для жанчын (55 гадоў) і мужчын (60 гадоў). Такія ўзроставыя параметры захаваліся яшчэ толькі ў трох краінах – Расіі, Украіне і Узбекістане.

“Калі не будуць прынятыя захады для скарачэння дзяржаўных выдаткаў на выплаты пенсій працуючым льготнікам-пенсіянерам, дык не выключана, што можа спыніцца працэс павелічэння пенсій усім астатнім катэгорыям грамадзян”, – палохае Т. Пагонышава. У 2006 годзе працуючым пенсіянерам было выплачана больш за 260 мільярдаў рублёў. Праз два-тры гады гэтая сума можа скласці трыльён.

Між тым, калі ў 1985 годзе насельніцтва ва ўзросце вышэй за 65 гадоў складала 10%, дык у 2007-м – ужо 15%. У Беларусі зараз жывуць 2 мільёны 400 тысяч пенсіянераў. На выплату пенсій ідзе 11% валавага нацыянальнага прадукту, што ёсць самым высокім паказчыкам у СНД і краінах Балтыі.

Зразумела, сістэма льготаў засталася ў спадчыну ад савецкай адміністрацыйнай эканомікі, і ўжо паводле вызначэння яна не можа быць эфектыўнай.

Але ж і ліквідацыя льготаў адбудзецца, выглядае, паводле старых савецкіх рэцэптаў. Насельніцтва проста паставяць перад фактам. А людзі здымуць з сябе апошнюю кашулю. Абы не было вайны.

**А. Уласаў**

**працяг тэмы на стар.5**

## КАЛІ Б У БЕЛАРУСЬ ВЯРНУЎСЯ ПАЗЬНЯК

► **СТАР. 2, 4**

## ГОЛАД

### НОВАЕ ЭСЭ АЛЕГА АБЛАЖЭЯ

► **СТАР.7**

# ШТО БЫЛО Б, КАЛІ Б У БЕЛАРУСЬ ВЯРНУЎСЯ ЗЯНОН ПАЗЬНЯК?

**СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ, БЫЛЫ КІРАЎНІК БЕЛАРУСІ:**

## "Я Б ВЕЛЬМІ ЦЕШЫЎСЯ"

Можа, Кансерватыўна-хрысціянская партыя троху б ажыла. Да іх, можа, далучыліся б новыя людзі. Але вельмі даўно ён тут не быў. Яму трэба было б адаптавацца да нашых умоваў тры-чатыры месяцы. Што да мяне, то я б вельмі цешыўся, калі б ён вярнуўся. Таму што ў яго ёсць адна якасць, якой няма ў большасці нашых палітыкаў. Ён падпарадкаваны толькі свайму сумленню і больш нікому.

**АЛЕНА, НАСТАЎНІЦА:**

## "МІТЫНГУ НЕ АДБЫЛОСЯ Б"

Калі б ён вярнуўся, яго б арыштавалі ў цягніку і адправілі на Валадарку. Але стотысячнага мітынгу ў яго абарону не адбылося б. Усе па-ранейшаму займаліся б сваімі справамі. Пілі б піва і хварэлі за якога-небудзь Калдуна. Навошта яму прыязджаць? Што яму тут рабіць? Перашкаджаць усеагульнаму "шчасцю"?

**АКСАНА, СТУДЭНТКА:**

## "ЁН ПАВІНЕН ІСЦІ ПЕШКІ"

Для майго пакалення гэта не столькі палітык, колькі літаратурны персанаж. Таму вяртацца ён павінен літаратурна. Ні ў якім разе не самалётам і не аўтобусам. Ён павінен ісці пешкі. У вярыгах і з кійком. Не палітык учорашняга дня павінен даганяць дзень сённяшні. А Кароль Лір павінен крочыць па сваім згвалтаваным каралеўстве. І каб Вячоркі з Лябедзькамі йшлі насустрач. А Пазьняк ім казаў нешта накшталт: прэч, фарысеі! О, гэта будзе той яшчэ спектакль. Прынамсі, такое надоўга зацьміла б экраны БТ.

**АЛЕСЬ ПУШКІН, МАСТАК:**

## "СЫГРАЕ РОЛЮ КАМЕРТОНА"

Больш шчырым стаў бы лагер дэмакратаў. Парфяновічы з Сініцынымі і так ужо шчырыя, а па вяртанні Пазьняка вельмі яскрава праявіцца роля Лябедзькі і Вячоркі. Больш спарадкавана выбудуецца спектр беларускай апазіцыі. Пазьняк адыграе ролю камертона для гэтага аркестра. Ён стане страйнейшым. А пакуль фагот грае партыю трамбона. Удзельнічаць у прэзідэнцкай кампаніі Пазьняку было, канечне, неразумна. Лепш фатаграфаваць і выдаваць кнігі. І рабіць прэзентацыі ў дольнай залі Чырвонага касцёла. Гэта тут больш патрэбна, чым у Нью-Ёрку. Заля, вядома, не ўмясціла б усіх ахвочых. Але можна было б падысці, узяць за гузік, пачуць яго голас. Зрываючы маскі, ён бы ясна і канкрэтна гаварыў "чаму". Прэса б яго пастаянна цытавала. У яго была б свая калонка ў якіх "Беларусах і рынку". Гэта было б добра – разам з народам несці свой крыж.

**АЛЕГ ТРУСАЎ, СТАРШЫНЯ ТБМ:**

## "ФРАНТЫ" ВАКОЛ ЯГО НЕ ЗЛУЧАЦЦА"

Адбудзецца вялікая прэс-канферэнцыя. Народ прыйдзе паглядзець на Пазьняка. І на гэтым усё скончыцца. Я не думаю, што нешта будзе грандыёзнае. "Франты" вакол яго не злучацца. Калі б ён вярнуўся раней, такое магло б быць. А зараз ужо час прайшоў. Будзе шмат да яго пытанняў. І пойдуць усе з той сустрэчы незадаволеныя адказамі. На жаль, час ягo, як палітыка, мінае. Яшчэ не мінуў, канечне, усякія могуць быць экстрэмальныя моманты. Але пакуль нічога такога наперадзе не бачна.

**ВАЛЕРЫ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## "НЕ ТРЭБА ЯМУ ВЯРТАЦЦА"

Пазьняк зараз з'яўляецца нават не чалавекам, а нейкая істотай, якая ўзнеслася і са сваёй вышыні нешта вяшчае. І таму ёсць надзея ў беларусаў, што, "вось, калі вернецца Пазьняк, нешта зменіцца". А калі ён возьме і вернецца, і людзі пабачаць яго ў аблічча зямным, то гэта сапсуе надзею. Павінна ж быць надзея. Нічым не абгрунтаваная, але ж светлая, апошняя. А сваім вяртаннем ён гэтую надзею заб'е. Зараз ён жыве як духоўная з'ява. І духоўнае на матэрыяльнае так проста паўплываць не можа. Таму вяртацца не трэба. Нельга Буду паказваць людзям. Усе ведаюць, што ён жыве ў Гімалаях... Не трэба яму вяртацца.

**ЮРАСЬ ХАДЫКА, НАМЕСНІК СТАРШЫНІ БНФ:**

## "ЯГО ВЯРТАННЕ НІЧОГА НЕ ЗМЕНІЦЬ"

Ён згубіў магчымасць сваім вяртаннем нешта павярнуць. Згубіў увосень 1996 году. А зараз ужо занадта позна. На яго не забыліся, але ён сам сябе скампраметаваў. Як ставіцца да чалавека, які заклікае ахвяраваць, змагацца, а сам хаваецца ў цёплых краях? Каму гэта падабаецца? Таму ягоная рэпутацыя – ці то труса, ці то хлуса, яна, фактычна, знішчыла яго як палітыка. А для таго, каб рэпутацыю зараз заваяваць, трэба прыкласці такія намаганні, што я нават не ведаю, ці змог бы ён гэта зрабіць з той камандай, якая ў яго засталася. Я скептык. Яго вяртанне нічога не зменіць.

**ГЕНАДЗЬ, ЛЕКАР:**

## "ЁН СТАЎ БЫ ДУХОЎНЫМ ЛІДЭРАМ"

Ён мог бы ажывіць ідэю грамадзянства БНР. Калі б прэзідэнт БНР Пазьняк быў тут, грамадзянамі яго краіны сталі б многія. Можа, нават, і мільён, які галасаваў у 95-м годзе за мову і "Пагоню". Адных толькі рэкамендацыяў такога прэзідэнта хапіла б на многае. Стаў бы беларускім мулом Амарам, духоўным лідэрам.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "ПАЗІЦЫЯ ПАЗЬНЯКА ВЕЛЬМІ ІСТОТНАЯ, АЛЕ НЕ ЯК ПАЛІТЫКА"

Ну, вернецца і вернецца. Вяртанне Пазьняка будзе падобнае да вяртання Салжаніцына ў Расію. Салжаніцын, на якога малілася расійская інтэлігенцыя, вярнуўся. І апынуўся ў такім катуху. Як Салжаніцын апынуўся на ўзбочыне палітычнага, сацыяльнага, культурнага жыцця сучаснай Расіі, у тым самым месцы апынецца і Пазьняк. Праўда, розніца ў тым, што ў эміграцыі Салжаніцын адыгрываў магутную ролю. Пазьняк ролю адыгрываў тут, а ў эміграцыі яе цалкам згубіў. А ў сэнсе палітычным... Нават Напалеон Банапарт не змог увайсці двойчы ў адну раку. Калі Пазьняк вернецца на Бацькаўшчыну, дай Бог, каб яму хапіла розуму спакойна заняць сваё месца. Хатку купіць у вёсцы, ці дзе. І трымаць сваю пазіцыю першага адраджэнца. Бо пазіцыя Пазьняка – яна вельмі істотная. Будуць і журналісты прыязджаць.

**Працяг тэмы на стар.4**



**Міліцыя здымае** *з маста расцяжку «Свабоду маладафронтаўцам!» Мінск, 15 траўня 2007 году. Суд над сябрамі гэтай незарэгістраванай арганізацыі пачнецца 30 траўня.*

# НЕ ЗДРАДЖВАЦЬ САБЕ МОГУЦЬ НЕ ЎСЕ



**Рок-гурт «Крама».** *Фота з архіву.*

Канцэрт-прэзентацыя новага альбома гурта "Крама", запланаваны на 30 траўня ў мінскім клубе Night Star, забаронены. Упраўленне культуры Мінгарвыканкама адмовіла ў правядзенні канцэрту, спаслаўшыся на "нізкі мастацкі ўзровень музыкаў". Рэдакцыя "Еўрарадыё" патэлефанавала зоркам беларускай эстрады, каб дазнацца, як яны ацэньваюць мастацкі ўзровень легендарнага рок-гурта.

Дырыжор Нацыянальнага прэзідэнцкага аркестра Міхаіл Фінберг: *«Нічога дрэннага пра гэты гурт сказаць не магу».*

Васіль Раінчык: *"Крама" вельмі падабаецца. Дый наогул я яе лічу самым прыгожым гуртом».*

Іна Афанасьева: *"Мне яны заўсёды падабаліся. Гэта ўсё ж такі самыя першыя нашы, самыя што ні ёсць сапраўдныя беларусы".*

Аляксандр Ціхановіч: *"Гэта адзін з першых беларускіх рок-гуртоў. Тых, якія з'явіліся ўжо ва ўмовах постсавецкай прасторы. Гурт, які вельмі своеасаблівы".*

Анатоль Ярмоленка ганарыцца сумеснай работай з музыкамі (у 1996 годзе "Крама" і Ярмоленка спявалі разам "Гомельскі вальс"): *"Гэта, на маю думку, цікавы і добры калектыў. То бок у авангардзе рок-гуртоў, якія ў нас можна пералічыць на пальцах, гэты ў першай тройцы. І Варашкевіч таксама вельмі здольны і талковы ў сваім жанры. Як музыка, я яго цаню".*

Ірына Дарафеева: *"Я магу сказаць, што мне вельмі падабаецца іх прафесійны ўзровень і выканаўчае майстэрства. І ў цэлым магу сказаць, што яны проста малайцы. Так доўга трымацца і не здраджваць сабе могуць далёка не ўсе".*

Дарэчы, Фінберг, Ціхановіч, Раінчык і Ярмоленка ўваходзілі ў склад журы беларускага адборачнага тура на «Еўрабачанне».

"Крама" ўваходзіць у спіс забароненых у Беларусі рок-гуртоў за тое, што выступае на канцэртах і мітынгах дэмакратычных сілаў.

**Паводле СМІ**

## СУСЕДЗІ

# ПАЛЯКІ ЗНІКНУЦЬ ЗУСІМ...

Калі сённяшнія дэмаграфічныя тэндэнцыі не зменяцца, дык праз 140 гадоў у Беларусі ўвогуле не застанецца палякаў.

Такія высновы са статыстычных разлікаў зрабіў і прадставіў журналістам дарадца польскага прэм'ер-міністра Міхал Дворчык. З яго слоў вынікае, што ў Казахстане, Расіі і Украіне палякі знікнуць ужо праз 30 гадоў, у Чэхіі – праз 90, у Латвіі – праз 100, у Літве – праз 130. Выглядае, што найдаўжэй прадстаўнікі суседняе нацыі "затрымаюцца" ў нашай краіне, у Беларусі.

Тым часам, адзначыў Дворчык, лік палякаў сістэматычна павялічваецца ў ЗША, дзе сёння ён складае 9 мільёнаў чалавек.

Натуральна, польскі ўрад не мае намеру мірыцца з такімі прагнозамі і кажа пра неабходнасць праводзіць скаардынаваную палітыку адносна суродзічаў за мяжой. На сённяшні дзень галоўнай перашкодай у гэтай працы з'яўляецца тое, што апекай над замежнымі палякамі займаецца занадта шмат інстытуцый, таму немалыя сродкі дзяржаўнага бюджэту на гэтую справу (150 млн. злотых штогод) выкарыстоўваюцца неэфектыўна. Цяпер мяркуецца аб'яднаць усю гэтую дзейнасць адзінай урадавай праграмай супрацоўніцтва з палякамі за мяжой.

Дворчык нагадаў, што цяпер у працэсе кансультацый знаходзіцца праект закона аб грамадзянстве і Карце паляка. Асобы, у якіх будзе такая Карта, змогуць пасяліцца ў Польшчы і без цяжкасцяў перасякаць польскую мяжу. Таксама яны будуць мець доступ да ўсіх узроўняў адукацыі на тых самых умовах, што і палякі, якія жывуць у Польшчы.

**Паводле ПАП**

kamunikat.org

# ЗАДОЎЖАНАЕ ВЯРТАННЕ

## КАЛІ Ж ЗАПРАЦУЕ ПАЗЬНЯК?

Пазьняка ў Беларусі не забылі. Але не таму, што ён харызматычны, маральны ці прынцыповы. І не таму, што "справа яго жыве" (хутчэй – наадварот). Пазьняка не забылі, бо для мільёна беларусаў ён працягвае ўвасабляць сабою нацыянальнага палітыка.

Спрэчкі вакол яго вяртання скончаюцца звычайна дзвюма процілеглымі высновамі: пра духоўнага лідэра і апошнюю надзею, з аднаго боку, і пра няўдачніка-эмігранта, які безнадзейна адстаў ад жыцця на Бацькаўшчыне. Дазволю сабе не пагадзіцца ні з першым, ні з другім. Апошняя надзея – гэта як вера ў цудоўнае выратаванне, да рэальнасці дачынення не мае. І не адстаў ён, зразумела, бо ў сённяшніх умовах інфармацыйнай цывілізацыі можна і на Марсе жыць у Беларусі.

Спрэчкі пра вяртанне Пазьняка доўжацца ўжо дзесяць гадоў і ў сутнасці сваёй маюць не фізічнае вяртанне, а вяртанне да справы, да дзейнасці з вынікамі ў маштабах краіны. Груба кажучы: калі ж запрацуе гэты брэнд — Пазьняк? Вось пра што мы спрачаемся.

Мы дапускаем, што ў сваёй эміграцыі ён можа і павінен (паколькі займае гэтую нішу) працаваць дзеля ўсяго народа, а не толькі для закрытай групы сваіх адданых паплечнікаў.

Мы разумеем, што аб'яднаць беларусаў на перамены можа толькі нацыянальная ідэя. Апазіцыя гэтага разумець не хоча ці не можа. Але чаму гэтага не робіць Пазьняк? Чаму здавольваецца вузкай групай, чаму не звяртаецца да інтэлігенцыі, не запрашае да сябе актыўных людзей? Загадка. За часы эміграцыі можна было стварыць у грамадстве сапраўдную кансалідаваную плынь са сваімі суполкамі, друкам, асветай... Не позна тое і сёння, бо альтэрнатывы нацыянальнай ідэі няма. Талокі ў




belzhaba.com

Курапатах – рэальная справа, але туды не сталі хадзіць тысячамі. Тым часам, апроч КХП, у Беларусі ёсць дзясяткі, калі не сотні асяродкаў, гатовых да супрацы. Дзеля розных прычын людзі не запісваюцца ў КХП, але за брэндам Пазьняк яны б пайшлі. Чаму ён не кліча, не запрашае, не кансалідуе?..

Мы чытаем артыкулы Пазьняка, шмат з чым згаджаемся, але наша чытаннезгаджанне яўна задоўжылася.

13 траўня Пазьняк размясціў у інтэрнэце свой новы выступ на Сойме КХП:

"Звяртаю ўвагу Сойму на характарыстычную прыкмету, якая выяўляецца вельмі выразна цяпер у беларускім грамадстве – узмацненне антыбеларускай палітыкі... Рэзка ўзмацніўся пераслед беларускай школьнай і навучэнскай моладзі за беларускую мову і беларускія погляды, выявілася, што ў школах існуе сістэма сексотаў сярод настаўнікаў, якія адсочваюць ідэйных беларусаў і даносяць на вучняў у КГБ. Маладых людзей цяпер арыштоўваюць за нацыянальныя патрыятычныя погляды, рыхтуюць суды пад выглядам "за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі".

Дабіваюць важнейшую сферу нацыянальнага жыцця – вялікую беларускую літаратуру і арганізацыю пісьменнікаў. У гэтым годзе быў ліквідаваны і забаронены Літфонд – важная і апошняя структура, якая трымала пісьменнікаў. Пазбаўляюць памяшканняў апошнія беларускія арганізацыі (ТБМ, "Бацькаўшчына" і інш.)... Наступ на ўсё беларускае актывізаваўся асабліва за апошнія паўгода, і мы бачым, што ён мае не толькі сістэмны характар як выяўленне агульнай антыбеларускай стратэгіі, але развіваецца таксама па макрашляхах, гаворачы іхнай расейскай тэрміналогіяй, — "даходзіць да кожнага чалавека".

Пазьняк сапраўды акцэнтуе ўвагу на тым, што хвалюе свядомых грамадзян краіны і на чым не акцэнтуюцца іншыя палітыкі. Што ж прапануе Пазьняк? Дапамагчы людзям усвядоміцца, бо цемната народная – адвечная беларуская хвароба – вось прычына таго, што людзі дазваляюць уладам праводзіць антыбеларускую палітыку. Але што для гэтага рабіць? Пазьняк адказвае:

"Цяперашняе нацыянальнае развіццё беларускага грамадства можна ацаніць як крок наперад – два ў тыл. Гэта дрэнна. Але не апускайма рук, бо вельмі важна, каб быў бы гэты крок наперад. Логіка змагання рана ці позна прыводзіць да змены гэтай парадыгмы павольнага знішчэння, спыняюцца крокі ў тыл і застаюцца толькі наперад".

Гістарычны працэс, вядома, магутны фактар. І Пазьняк прапануе чакаць – чакаць, калі зменіцца парадыгма. Навокал узмацняецца і імкнецца "дайсці да кожнага" антыбеларускі ціск. А нам – чакаць, "не апускаючы рук".

На маю думку, парадыгма можа змяніцца і не абавязкова ў пажаданы нам бок. Бо ў час ікс нас проста ўжо можа і не быць. Палітыка дэнацыяналізацыі і цемната народная да таго часу пакрыюць сабой усё.

Усе нашы крокі наперад (два ў тыл) заўсёды будуць неэфектыўнымі, калі не пачнецца нацыянальнай кансалідацыі. Самы просты і зразумелы людзям спосаб яднання – вакол асобы лідэра. Чаму і ўзнікаюць раз-пораз гаворкі пра вяртанне Пазьняка. Але сувязь у Пазьняка аднабаковая. Сказаў і – абарвалася. Хоць бы жывы журнал завёў у інтэрнэце, дык не, захоўвае Пазьняк самаабароннчы вобраз недаступнага мулы Амара.

Праблема, такім чынам, у той вобразнай лідэрскай пасадзе, на якую Пазьняка выбраў мільён беларусаў. І пакуль Пазьняк там сядзіць, перавыбраць лідэра шматкроць цяжэй, чым калі б месца было вакантным. У мяне няма сумневаў, што сённяшняе маладое пакаленне дасць не аднаго вартага гэтай пасады лідэра. Але пакуль месца гэтае – у грамадскіх стэрэатыпах – занятае брэндам Пазьняк, найлепшае, на што могуць разлічваць новыя лідэры – гэта "хімія" або краты. Дык можа тым часам запрацуе і сам брэнд Пазьняк? Можа вернецца ў рэальную палітыку рэальнае Беларусі як рэальны лідэр? Вось што мы насамрэч маем на ўвазе пад ягоным вяртаннем, а не тое, на верталёце ён прыбудзе, на цягніку альбо пешкі.

**Сымон Музыка**

# ЛЬГОТНЫ ПАПУЛІЗМ

## НАМЕНКЛАТУРА ВЫПРАБОЎВАЕ ЦЯРПЛІВАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

Краіну, у якой 64% сем'яў атрымліваюць льготы, можна назваць калгасам. Ці вялікай бальнічнай палатай. Яшчэ гэта дыягназ якасці эканамічнай палітыкі. Раздаць кожнай сястрыцы па завушніцы – гэта не тое самае, што рэальна дапамагаць усім, хто патрапіў у бядоту. Раздаць па 9 даляраў 2,38 мільёнаў хатніх гаспадарак – гэта пазбавіць паўмільёна суграмадзянаў, якім сапраўды патрэбная дапамога, неабходных лекаў, магчымасці перасоўвацца і быць паўнавартаснымі членамі грамадства.

Цяперашння сістэма льготаў – гэта дыскрэдытацыя дзяржавы. Яна неэфектыўная, бязадрасная і амаральная. Яна робіць здаровых людзей цынічнымі й чэрствымі ў дачыненні да дапамогі тым, каму яна патрэбная. Рашучасць уладаў правесці кардынальную рэформу гэтай сістэмы заслугоўвае ўхвалы. Аднак ставіць дзясятку за адно толькі жаданне нельга. Галоўнае – вынік. Меркаваныя змены могуць толькі пагоршыць негатыўныя з'явы ў грамадстве...

У выніку запланаванай ліквідацыі сацыяльных льготаў і прывілеяў бюджэт сэканоміць каля 300 мільёнаў даляраў. Сума для ўраду яўна не крытычная.

Паколькі ў Беларусі няма дэмакратыі і палітычнай канкурэнцыі, чыноўнікі клапоцяцца, у першую чаргу, аб тых праграмах, якія ім бліжэй да сэрца, дакладней – кішэні. Наменклатура заблакавала магчымасць людзей уплываць на вынікі выбараў. Яна не адчувае ціску знізу. Таму яна і выбірае скасаванне сацыяльных, а не карпаратыўных ільготаў. На апошніх можна, прынамсі, зарабіць.

Наўрад ці адзін марш інвалідаў-калясачнікаў можа змяніць расклад лабісцкіх сілаў. Не выключана, што ўрад зробіць жэст добрай волі на карысць людзей, якія перасоўваюцца на калясках, але рэч у тым, што нават яны не ведаюць, што атрымаюць у выніку рэформы сістэмы льготаў. Гэта гаворыць аб адсутнасці дыялогу паміж грамадствам і ўладай, урадам і парламентам.

Прадстаўленыя ўладамі прапановы аб рэфармаванні сацыяльных ільготаў ніяк нельга назваць ліберальнымі. Перад намі чарговы тыповы бюракратычны праект, бессістэмны і супярэчлівы. Наменклатура чарговым разам хоча выпрабаваць цярплівасць беларусаў. У сітуацыі, калі студэнтаў, пенсіянераў, чарнобыльцаў і інвалідаў пазбаўляюць ільготаў на 10-20 даляраў за месяц, захаванне карпаратыўных ільготаў для прадпрыемстваў у мільёны даляраў – гэта грубы выклік. Вертыкалі — грамадству.

Падсумоўваючы вынікі работы эканомікі ў першым квартале 2007 году, А. Лукашэнка не змог схаваць факт пагаршэння эканамічнага становішча. Ён раздаў чарговую порцыю апошніх "кітайскіх" папярэджанняў і пагрозаў: «Напружыцца трэба ўсім. Ніякіх непатрэбных раз'ездаў, нарадаў быць не павінна. Зараз важная рэальная праца на месцах. Ад кожнага чыноўніка і ўраду ў цэлым я чакаю канкрэтных вынікаў". Наменклатура сапраўды напружылася. Яна паспяхова адстаяла мільярды даляраў карпаратыўных ільготаў, ахвяраваўшы сацыяльныя льготы псеўдарынкавай рыторыцы. Напружвацца за студэнтаў, чарнобыльцаў і інвалідаў у нашай краіне ў сістэме ўлады няма каму.

**Яраслаў Раманчук**

*Друкуецца ў скароце. Цалкам артыкул змешчаны на сайце www.ucpb.org*

# РЭДКАЯ ПТУШКА — ДЭФЛЯЦЫЯ

## ЦІ ДАЛЯЦІЦЬ ЯНА КАЛІ-НЕБУДЗЬ ДА БЕЛАРУСІ?

У панядзелак у Беларусі зноў падвысіліся кошты на бензін. Амаль на палову пабольшала плата за дзіцячыя садкі. А міласэрнасць (у сэнсе, утрыманне у Доме міласэрнасці) стала даражэйшай на 20%. Тым часам улады заяўляюць, што цэны ў краіне зніжаюцца.

На мінулым тыдні старшыня Нацбанка Пётр Пракаповіч паведаміў, што ў Беларусь заляцела рэдкая птушка – дэфляцыя.

Дэфляцыя – гэта супрацьлегласць інфляцыі. Прасцей кажучы, Пракаповіч распавёў пра тое, што нібыта ў красавіку цэны ў Беларусі знізіліся. Праўда, амаль незаўважна – на 0,2%. Але ж, прынамсі, не пабольшалі!

А ці адчулі вы на сваім кашальку, што няспынны рост цэнаў замарудзіўся? Прыгадайце, што гаварыў сёлета ў студзені віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў. Ён абяцаў, што, нягледзячы на падвышэнне цаны на расійскую нафту, бензін за 2007 год у Беларусі падаражэе не больш, як на 6-8%.

З 14 траўня 92-гі бензін каштуе ўжо 1930 рублёў за літр (па стане на 1 студзеня 2007 – 1760). Такім чынам, цана на яго падвысілася на 9,7%. 95-ты цяпер прадаюць па 2200 рублёў за літр. Рост за той самы перыяд – акурат 10%. Разлік уладаў просты: той, хто плаціў 2000 рублёў, заплоціць і 2200 – не збяднее. Потым будуць і 2500, і 3000 – пакуль аўтааматары не пачнуць выказваць сваё абурэнне.

Адначасова нам тлумачаць, што грошы, якія раней выкарыстоўваліся на льготы, цяпер пойдуць на святое – напрыклад, на праграму "Дзеці Беларусі". Праўда, замоўчваюць, што адмяняецца і частка сацыяльнай дапамогі, арыентаванай на тых самых дзяцей. Раней хапала і на льготы, і на датацыі ЖКХ. А цяпер што, грошы скончыліся?

Адназначнага адказу на гэтае пытанне ўлада не дае. Падчас прэзідэнцкага пасланьня напрыканцы красавіка Аляксандр Лукашэнка заявіў, што "страшэнны ўдар", які Беларусь атрымала напачатку году ад расейскіх "братоў", пераадолены.

Аднак ужо на мінулым тыдні з тых самых вуснаў гучалі зусім іншыя заявы. Аляксандр Лукашэнка бэсціў урад за тое, што ён не зрэагаваў належным чынам на змены ў эканамічнай сітуацыі. І адначасова заяўляў: ніякай карэкціроўкі эканамічнага курсу не будзе!

Гэта сведчыць пра тое, што цэнавая ліхаманка працягнецца. Бо насамрэч мы яшчэ толькі пачынаем адчуваць наступствы падвышэння коштаў на расійскія энерганосьбіты. Дагэтуль Беларусь плоціць за газ па старой цане, і запазычанасць перад "Газпромам" павялічваецца. Афіцыйны Мінск разлічвае выкараскацца з гэтай яміны за кошт крэдытаў, а не рэформаў. Але гэта заганны шлях, які здольны часова прыхаваць хваробу, але не вылекаваць яе.

**Валеры Філін**

Саюздрук

# "ПЕСНІ БЛАТАТЫ"

## АЛЬБО ПОЎНЫ СУВЕРЭНІТЭТ

Дзіўлюся здольнасці дзяржаўных СМІ знаходзіць сваіх аднадумцаў у цывілізаванай Еўропе. Газета "7 дней" публікуе інтэрв'ю з рэдактарам французскага выдання «Bastill-Republique-Nations» П'ерам Ляві.

*"Лукашенко не реагирует на «команды» Брюсселя и Вашингтона, а это может послужить плохим примером для лидеров других стран. Таким образом, Беларусь, сохраняя полный суверенитет, ставит себя под удар. (...)*

*Считается, что западные ценности теперь превалируют на европейском континенте. Поскольку Беларусь выпадает из общего контекста, позиционируя себя как абсолютно независимое государство, все настойчивее дают о себе знать структуры, ангажированные на создание негативного ареола вокруг руководства республики. Белорусской оппозиции оказывается целевая финансовая и моральная поддержка. (...) Запад настойчиво требует, мол, поменяйте свою политическую систему, выполните все наши условия, и мы вас пустим в рай. Но рай ли это? Насколько радужна подобная перспектива, хорошо иллюстрируют события на Украине".*

Не ведаю, наколькі ўплывовая тая французская газета, але ў цынізме яе рэдактару не адмовіш. Што месье разумее пад "рамкамі, якія еўрапейскі істэблішмент навязвае Беларусі?" Ці не правы чалавека, свабоду інфармацыі і сумленныя выбары? І чаму Францыі можна і трэба карыстацца "заходнімі каштоўнасцямі", а мы вартыя толькі "поўнага суверэнітэта", з дубінкамі, аўтазакамі і палітвязнямі? І што такога жахлівага адбываецца ва Ўкраіне? Ці не страшыць французскага пана само жаданне ўсходніх еўрапейцаў стаць паўнавартаснымі грамадзянамі Еўропы?

Што яўна не належыць да прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі, дык гэта бяспека звычайных грамадзянаў Беларусі. "Народная газета" публікуе вельмі карысны матэрыял для аматараў пакатацца на каруселях з дзецьмі.

*"…Производители аттракционов тоже не берут на себя ответственность. Они дают гарантию на изделие, не более того, а что касается дальнейших проверок технического состояния аттракционов в процессе эксплуатации, то бесплатно их проводить никто не хочет. Вряд ли кто захочет безвозмездно делать для всех и инструкцию по техническому диагностированию.*

*А раз нет документа (этой самой инструкции), то и проверять то же "Колесо обозрения" в каждом белорусском городе будут по разным критериям. А общей и главной ответственности за то, от чего зависят здоровье и даже жизни людей, получается, никто не несет. При огромном количестве в нашей стране нормативных и регулирующих документов такие вещи смотрятся парадоксальным пробелом".*

Пагроза жыццю і здароўю выглядае ў нас "парадаксальным прабелам"? Памятаеце леташнюю аварыю на велізарным "Чортавым коле" у мінскім Цэнтральным дзіцячым парку, калі канструкцыя спыніла свой рух на дзве гадзіны. Асабліва ўдзячнымі засталіся пасажыры адкрытых кабінаў. Экстрыму атрымалі на ўсё жыццё.

А "Беларускі Час" абурэецца святкаваннем Дня Перамогі ў сталіцы.

*"… уважая всю ту работу, которую проделали организаторы празднования, тем не менее не перестаешь поражаться, как чиновничья тупость и леность мысли может испортить любое благое дело. Только представьте: концертная площадка у Национальной библиотеки. Памятник Франциску Скорине. Здесь даже атмосфера какая-то иная – величественнее, что ли. Сотни зрителей от мала до велика. Ветераны с ленточками на лацканах пиджаков и позванивающими наградами. И – блатные песенки со сцены...*

*Можно назвать это шансоном. Можно городским романсом. Но суть от этого не меняется. И песни нашей блатоты так же далеки от произведений Азнавура или Вертинского, как День Победы от 22 июня. И так же далеки от настроений и запросов общества. Надо было видеть недоумение на лицах ветеранов! Надо было слышать, как ни одного хлопка, не говоря уж о каких-либо бурных аплодисментах, не раздалось из толпы молодежи! Не те песни должны звучать в День Победы… И это было понятно всем, кроме организаторов концерта. Чиновники от культуры в очередной раз оказались самым слабым звеном праздника".*

Калі дзевяціпавярховікі насупраць шэрай спаруды бібліятэкі – велічнае месца, дык чаму б "рускі шансон" не лічыць патрыятычнай лірыкай? Чыноўнікі якраз працуюць у рэчышчы дзяржаўнай культурнай палітыкі. Гэта папершае. А па-другое, як быць з ветэранамі СМЕРШа, заградатрадаў і НКВД? Для іх, я ўпэўнены, "Владимирский централ" гучаў, як дарагі сэрцу падарунак.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# "ДАЙ ПАЖАВАЦЬ"

## АЛЬБО КОННЫ ЗАБЕГ КАНДЫДАТАЎ

Я слухаю многа розных радыёстанцыяў на розных хвалях. Але нідзе не чуў такога тэхнічнага браку, як на частаце 612 кГц падчас трансляцыі Еўрарадыё. 11 траўня прагучалі першыя 20 хвілін праграмы і потым "пласцінку заела" – праграма стала паўтарацца другі раз, яшчэ праз 20 хвілін – трэці... Сябрук на гэта расказаў анекдот. Сустрэліся два савецкія магнітафоны. Адзін кажа: "Слухай, дастаў японскую касету – класная рэч!" Другі: "Дай пажаваць".

У тыя часы, калі не было радыё, журналіст мог хавацца за псеўданімамі ды выступаць на старонках газеты ў розных амплуа – тут ён аўтар рэпартажа, тут – фельетонаў, а тут – вершыка. На радыё такі фокус не пройдзе. Вось Радыё Рацыя – працуе там такі Васіль Кроква. Вядзе ён праграму, чытае анонс перадачы "Жыццё з літаратурай". Пачынаецца перадача: "Пры мікрафоне Алесь Аркуш..." – голас трохі зменены, але той самы. Мне здаецца, што на адным радыё журналіст мусіць выступаць пад адным імем, нават калі ён робіць розную работу. А яшчэ лепей, калі розныя работы будуць рабіць розныя людзі.

На Радыё Рацыя 13 траўня Паўлюк Быкоўскі казаў пра выбары кіраўніцтва ў лагеры апазіцыі і параўнаў іх з коннымі забегамі, маўляў, "кандыдаты прыйшлі "ноздря в ноздрю..." Я згодны тут з палітолагам, што важданіна з выбарамі заслугоўвае іроніі. Адно што ёсць моўная заўвага. Спадар Быкоўскі скарыстаў расейскую прымаўку, ніяк не абазначыўшы гэта. У пісьмовых тэкстах іншамоўныя словы выдзяляюць двукоссем, іншым шрыфтам. А калі гавораць, тады варта змяніць інтанацыю ці зрабіць паўзу, ці скарыстаць выразы накшталт "як кажуць", "як той казаў", "так бы мовіць".

Між іншым, хацеў я знайсці беларускі адпаведнік прымаўкі "ноздря в ноздрю". Ні сам, ні сябры, у якіх пытаўся, не прыгадалі. Можа хто ведае – падкажыце. На тым усё. Дзве дзюркі ў носе, і скончылася.

**Сяржук Вітушка**

# ГОЛАД

Стрэмкі

## БОЛЬШАСЦЬ ЗАДАВАЛЬНЯЕЦЦА "МОХАМ"

Голаду, пра які пісалі Змітрок Бядуля ды Кнут Гамсун, мне, на шчасце, не давялося спазнаць. А вось бацька дзяліўся досведам, якая слізкая і нясмачная лебяда. "Дзядзюсь" жа ягоны казаў часам гаротна: "От, здэцца, каб моху туды напхоў!.."

"Туды" – гэта, вядома, у страўнік. Часы памяняліся, і мне давялося пакутаваць ад іншага голаду. Калі пачуў смак да кніжак – а іх было так мала, і яны так хутка прачытваліся. Хіба можна забыць аднатомнік Эдгара Алана По ў чорнай вокладцы, што разгортвалася з трэскам, бо да мяне, бадай, ніхто яго ў бібліятэцы не браў. А былі там – і "Крумкач", але як трымцела мая рамантычная натура, чытаючы "Анабель Лі"! Пра апавяданні што ўжо й казаць. А якая была бяда, калі высветлілася, што ў таўстой кнізе Конан-Дойля вырваны апошнія старонкі, і я дагэтуль не даведаўся, чым скончылася гісторыя пра сабаку Баскервіляў. А як натхнёна апавядаў старэйшы брат гісторыю графа Монтэ-Крыста, так расчуліўся, што аж слязу неўпрыкмет выцер. Ды я так гэтай кнігі й не прачытаў, і не ведаю ўжо, ці здолею. Кнігі трэба чытаць своечасова – як і друкаваць. А потым быў Джэк Лондан у сталёва-шэрай вокладцы, двухтомнік Хэмінгуэя – о! У нас была настаўніца літаратуры, якая так напісала крэйдай на дошцы для пазакласнага чытання: "Э. Химан Гуэль. Старик и море". Цяпер не растлумачыш, чым быў тады для чытачоў "папа Хэм". Шмат пазней мне давялося ілюстраваць зборнік спадара Эрнэста для "Мастацкай літаратуры", і я быў незвычайна шчаслівы, калі рэдактарка прызнала намаляваны мной партрэт аўтара, які быў у маладосці для яе "богам".

Цяпер, на шчасце, забыліся пра кніжны голад, а тады кожны наталяў яго як мог – хто адчуваў такі, вядома. Які трэба было мець "блат", знаёмствы, стаяць у чэргах, "даставаць"!

Я на ўсе гэтыя хітрыкі не быў здольны, і пайшоў іншым шляхам. Ці забудзеш, якім шчасцем было пасля шматгадовай няроўнай барацьбы з усімі гэтымі Perfektum і Plusquamperfektum ляжаць у траве каля хлява і чытаць маіх любімых нямецкіх рамантыкаў! Цяпер, мабыць, толькі падлеткі каля сваіх манітораў так "з галавою" пагружаюцца ў віртуальную рэчаіснасць.

Усё мару стрэсці пыл з тых кніжак ды перачытаць. Але ці вернецца тое адчуванне?..

А жывапіс? Які жывапіс, калі ў школе не было нават настаўніка малявання, а наўкола – "калхозы, калхозы"... І як я марыў сустрэць калі-небудзь, убачыць сапраўднага мастака, такога, як на выразанай мною з часопіса ілюстрацыі – з эцюднікам, валасата-барадатага! І калі ўрэшце праз шмат гадоў у Маскве – тады эцюднік можна было купіць толькі там – я набыў сваю мару і прывёз дахаты, і расставіў, дык цешыўся і не мог нацешыцца! Яшчэ й цяпер ён ёсць у мяне, біты-перабіты, мазаны-перамазаны. "Твой эцюднік, мабыць, ад першай сусветнай вайны ў зямлі праляжаў!" – казаў мне прафесар Пятруліс... Вайна не вайна, але нацярпеўся, бядак, у мастацкіх бітвах.

Масква... ох, гэта Масква! Па ўсё трэба было туды ехаць – ці фарбы купіць, ці пэндзлікі, ці альбом які мастацкі. І – ездзілі. Ноч туды, у цягніку на паліцы, потым увесь дзень – выставы, музеі, галерэі, вечарам, калі пашанцуе – у філармонію на канцэрт, тады – ноч на вакзале, бо ўсе гатэлі тады насілі адну назву "гостиница МЕСТНЕТ". Пасля зноў дзень насычэння сябе культурай, і, урэшце, з чыгуннымі нагамі ў начны цягнік – дадому. І часта ўначы круціла ногі сутарга ад перастамлення – і ўсё ж, усё ж. Не дарэмна бавіў час у сталіцы імперыі, якую тады так не называлі.

Ці існуе цяпер такі голад? Як для каго. Большасць, тая большасць, што ўсіх і ўся падаўляе, задавальняецца "мохам", якога поўна ўсюды і заўсёды. Кажуць, гэта нармальна. Ды – сумна...

**Алег Аблажэй**

## Фотафакт



**«Заўжды гатовы!»** *12 гадоў таму ўлады з дапамогай рэферэндума вярнулі савецкую сімволіку ў якасці адзінай афіцыйнай. За гэты час выгадавалася новае юнае пакаленне.*

*Піянеры на лінейцы з нагоды Дня дзяржаўнага сцяга. Мінск, 14 траўня 2007 году.*

## Невядомая Беларусь

**18 траўня** ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень музеяў. Яшчэ ў 19-м стагоддзі краінай музеяў называлі Беларусь. Прыватныя зборы Радзівілаў і Тышкевічаў прыцягвалі шматлікіх даследнікаў, выходзілі цэлыя кнігазборы віленскіх, полацкіх, магілёўскіх старажытнасцяў. Але на працягу наступнага, 20-га стагоддзя вобраз Беларусі як краіны музеяў страціўся. Не тое, каб музеяў стала меней, але катастрафічна збяднелі іх калекцыі экспанатаў – знішчаных, згубленых, вывезеных за мяжу.

**20 траўня** 1654 году пачалася самая разбуральная і самая крывавая за ўсю гісторыю Беларусі трынаццацігадовая вайна з Маскоўскай дзяржавай, якая забярэ жыцці кожнага другога жыхара тагачаснай Беларусі.

**20 траўня** 1742 году нехта Сямён Чалюскін, расійскі марак-штурман дасягае самай паўночнай кропкі Еўразіі – мысу, які пазней будзе названы мысам Чалюскіна. Штурман ішоў да гэтай кропкі на аленях і сабаках больш за 6 тысяч кіламетраў. Пасля ягоны шлях паўтарылі савецкія палярнікі, якіх назвалі чалюскінцамі, а ўжо іх імя прысвоілі аднаму з мінскіх паркаў, які і сёння называецца паркам Чалюскінцаў.

**22 траўня** 1900 году пад Пухавічамі прыйшоў на свет Мікола Каспяровіч, беларускі этнограф, мовазнаўца й даследнік літаратуры. Ён напісаў агулам больш за 230 навуковых прац па розных тэмах, у тым ліку, некалькі слоўнікаў беларускае мовы. Але большасць ягоных твораў, што гэтак і засталіся ў рукапісах, была знішчана пасля ягонага арышту. Арыштавалі Міколу Каспяровіча яшчэ ў 1930-м годзе, у першую хвалю сталінскіх рэпрэсіяў супраць дзеячоў беларускай культуры. Пасля турмы ён мусіў жыць на выгнанні ажно ў Навасібірску, дзе выкладаў рускую мову. Але й там яго не пакінулі ў спакоі. У 1937-м ён быў зноў арыштаваны і расстраляны.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**РЭДАКЦЫЯ "СВАБОДЫ" ІМКНЕЦЦА ЗРАБІЦЬ ГАЗЕТУ ПАТРЭБНАЙ ВАМ.**

**МЫ ПІШАМ БЕЗ ЦЭНЗУРЫ І ГАТОВЫЯ ГАВАРЫЦЬ ПРА САМАЕ ВАЖНАЕ І НАБАЛЕЛАЕ, ШТО ХВАЛЮЕ І ЦІКАВІЦЬ ВАС.**

**НАШЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ КРЫНІЦЫ ДАЗВАЛЯЮЦЬ НАМ ВЫСВЯТЛЯЦЬ САМЫЯ ЗАТУМАНЕНЫЯ БАКІ НАШАГА АГУЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ.**

**МЫ ВАЛОДАЕМ ДАСТАТКОВЫМ ДОСВЕДАМ, КАБ НІЧОГА НЕ ПРЫДУМЛЯЦЬ "З ГАЛАВЫ" І ПРА САМЫЯ СКЛАДАНЫЯ РЭЧЫ ГАВАРЫЦЬ ПРОСТЫМІ СЛОВАМІ.**

**НАМ НЯМА ПАТРЭБЫ НЕШТА ХАВАЦЬ АД ВАС АЛЬБО ХЛУСІЦЬ ВАМ, АЛЬБО АГІТАВАЦЬ ВАС ЗА НЕШТА ЦІ СУПРАЦЬ ЧАГОСЬЦІ.**

**З ТАКОЙ ПАЗІЦЫЯЙ АДЗІНАЕ, ЧАГО МЫ НЕ МАЕМ І НЕ МОЖАМ МЕЦЬ У СЁННЯШНЯЙ БЕЛАРУСІ – АФІЦЫЙНАЙ РЭГІСТРАЦЫІ І МАГЧЫМАСЦІ АДКРЫТА РАСПАЎСЮДЖВАЦЦА ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ. АДНАК ГЭТА НЕ ПАВІННА ПАЗБАЎЛЯЦЬ ВАС І НАС ГАЛОЎНАГА: ВАС – ПРАЎДЗІВАЙ І ПОЎНАЙ ІНФАРМАЦЫІ, НАС – ЗВАРОТНАЙ СУВЯЗІ З ВАМІ.**

**МЫ З НЕЦЯРПЛІВАСЦЮ БУДЗЕМ ЧАКАЦЬ ВАШЫХ ПЫТАННЯЎ, ПАЖАДАННЯЎ І ЗАЎВАГ У ЛІСТАХ НА НАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС (EDIT@VILNIA.COM) АЛЬБО Ў SMS-ПАВЕДАМЛЕННЯХ (НЕ ЗВАНКАХ!) НА НУМАР +37068742185.**

**ВЫ САМІ МОЖАЦЕ ФАРМАВАЦЬ ЗМЕСТ "СВАБОДЫ", ЗАМАЎЛЯЦЬ ТЭМЫ ПУБЛІКАЦЫЙ, ПРАПАНОЎВАЦЬ СВАЮ ІНФАРМАЦЫЮ І СВАЁ МЕРКАВАННЕ ПРА ЎСЁ, ШТО ЛІЧЫЦЕ ВАЖНЫМ І ЗНАЧНЫМ ДЛЯ НАШАГА ГРАМАДСТВА.**

**БУДЗЕМ РАБІЦЬ НАШУ "СВАБОДУ" ЎСЕ РАЗАМ!**

## ПАДПІСКА НА СВАБОДУ

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС (ІНДЭКС, ГОРАД, ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА)
SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ СВАБОДЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: edit@vilnia.com) **Падпісана ў друк** 16.05.2007 22:54
**Адрас** 220013 г. Мінск, пл.Каліноўскага 1а